***Хмялеўская Н. У.***, *настаўніца пачатковых класаў,*
***Церах А. М.***, *настаўніца пачатковых класаў.*
*Махнавіцкая сярэдняя школа Мазырскага раёна Гомельскай вобласці*

# 100 крокаў да поспеху

## Заданні для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратурным чытанні

*Працяг. Пачатак гл. № 2 за 2022 г.*

**51.** Прадоўжыце рад слоў на прапанаванае правіла (па тры).

1) Аб'ява, сям'я, ... .
2) Мільён, паштальён, ... .
3) Багацце, насенне, ... .
4) Дуб, сцежка, ... .
5) Алена, Нарач, ... .
6) Сцяна, лядок, ... .
7) Герой, калектыў, ... .
8) Каўнер, будоўля, ... .
9) У школе, на палянцы, ... .

**52.** Утварыце прыметнікі, якія абазначаюць матэрыял, з якога зроблены прадмет.

Палатно — ... , фарфор — ... , гліна — ... , шоўк — ... , цэгла — ... , дрэва — ... , салома — ... .

**53.** Падбярыце да прыметніка адзін з двух назоўнікаў.

Пясочны: гадзіннік, край.
Тэлевізарны: завод, фільм.
Чытальная: канферэнцыя, зала.
Лясны: край, бераг.
Зямельны: участак, вал.
Звераваты: след, позірк.
Серабрысты: медаль, снег.

**54.** Насупраць дзеясловаў, якія абазначаюць гукі жывёл і птушак, запішыце адпаведныя назвы.

Узор. Брахаць — сабака.

Выць — ... , чырыкаць — ... , гагатаць — ... , каркаць — ... , стракатаць — ... , квахтаць — ... , мяўкаць — ... , кукарэкаць — ... .

**55.** Пазначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.

1) Кпіла пляма *з мыла*: «Ты мяне не *змыла*».
2) Белае *пакрывала* снегу *пакрывала* палі.
3) У сетку трапяць *акуні* — ты ў раку іх *акуні*, а затрапечуцца *ліні* — тады вады на іх *ліні*.
4) Я *кашу* траву, а сястрычка варыць *кашу* на снеданне.
5) *Горкі* фініш у Рыгоркі: нос разбіў, як ехаў з *горкі*.

**56.** Запішыце, раскрыўшы дужкі.

Падарыў (ты), сустракалі (мы), гуляў з (яна), запрасіў (вы), расказаў пра (я), зайшоў да (ён), сябруе са (я), паказаў на (яны), адпачывалі з (мы), пачаставаў (яна), спыніўся каля (ён).

**57.** Разгадайце і назавіце слова, у якім:

1) тая ж прыстаўка, што і ў слове *закрычала*,
той жа корань, што і ў слове *навар*,
той жа суфікс, што і ў слове *рыбка*,
той жа канчатак, што і ў слове *бярозка*;
2) тая ж прыстаўка, што і ў слове *паднесці*,
той жа корань, што і ў слове *нарэз*,
той жа суфікс, што і ў слове *мышка*,
той жа канчатак, што і ў слове *чараўніца*;
3) тая ж прыстаўка, што і ў слове *наехала*,
той жа корань, што і ў слове *ўсмешка*,
той жа суфікс, што і ў слове *зубкі*,
той жа канчатак, што і ў слове *трава*.

**58.** Размяркуйце прыведзеныя словы па ўказаных схемах.

| | |
|---|---|
| Корань, канчатак | |
| Прыстаўка, корань, канчатак | |
| Корань, суфікс, канчатак | |
| Корань, корань, канчатак | |
| Прыстаўка, корань, суфікс, канчатак | |

Пералесак, бабраня, пешаход, заморскі, дарога, лебедзь, узгорак, дрэва, каласы, прадзед, самавар, насавы, паднос, адвар, узгор'е, журналіст, насарог, ліпка, пыласос, насмешка.

**59.** Вызначыце колькасць словазлучэнняў у вершаваных радках Сяргея Грахоўскага.

Ударылі кроплі па даху.
Вадой захлынулася гаць.
А чайкі ўзлятаюць з размаху
І ў бляску маланак ляцяць.

**60.** Якія прыклады не з'яўляюцца словазлучэннямі:

1) расцвітае луг;
2) пад светлым небам;
3) буран наляцеў;
4) звонкі хор;
5) на дрэвах цямнела;
6) надыходзіў вечар?

**61.** Запішыце, якія назвы жывёл могуць уваходзіць у склад словазлучэнняў.

Працавіты як ... .

Гудзе як ... .

Слізкі як ... .

Галодны як ... .

Надакучлівы як ... .

Выкручваецца як ... .

Спрытны як ... .

Балбатлівы як ... .

Баязлівы як ... .

Нямы як ... .

Надзьмуты як ... .

**62.** Прапанаваныя словазлучэнні запішыце адным словам.

Сена касіць — ... , лес рубіць —... , лёд калоць — ... , сок выціскаць — ... , зямлю капаць — ... , снег падае — ... , рукі мыць — ... .

**63.** Запішыце лічбай колькі словазлучэнняў можна выдзеліць у сказах.

1) Першыя зоркі таямніча замігацелі ў небе.

2) Па дарожных каляінах бягуць звонкія ручайкі.

3) Стракатыя дзятлы заўзята барабаняць па дрэвах.

4) На беразе рэчкі расла адзінокая бяроза.

5) Крынічка поіць лясных жыхароў чыстай вадой.

**64.** Колькі слоў у сказах?

1) Учужойстаронцынетаксвеціцьсонца.

2) Жвавывожыкжывакукупашыўкажух.

3) Спеегрэчкапрыбарыіловіцьводарбаравы.

4) Успыхнуламаланкаібелымсвятломазарылана ваколле.

**65.** Адзначце, колькі памылак сустракаецца ў сказах.

1) Дяніс зауважыў надароге маленькае бесдапаможнае каценя.

2) Панебе бязконца плылі цяшкія тёмныя хмары.

3) Нагалінках берозы сядзять, як пушыстые камякі, верабы.

4) Снех рыпіць і асідае пат цяшкімі крокамі.

5) У піліпа было ня больш за сем капеяк.

**66.** Суаднясіце сказы са схемамі.

А) У невялікай вёсцы стаяла хатка.

Б) У хатцы жыла добрая і клапатлівая бабуля.

В) Бабуля мела вялікага, прыгожага і разумнага ката.

Г) Яна карміла яго смятанай і каўбасой.

Д) Кот любіў бабулю, суцяшаў яе.

1) У *якой? дзе?* ________ ________.

2) ________ ________ *каго?*, ________ *каго?*

3) *Дзе?* ________ *якая?* і *якая?* ________.

4) ________ ________ *каго? чым?* і *чым?*

5) ________ ________ *якога?, якога?* і *якога? каго?*

А — ___ , Б — ___ , В — ___ , Г — ___ , Д — ___ .

**67.** Складзіце па пытаннях сказы з аднароднымі членамі. Запішыце іх.

1) Якія гарады Беларусі з'яўляюцца абласнымі цэнтрамі?

2) Якія птушкі прылятаюць да нас з выраю?

3) Якія кветкі можна вырошчваць на клумбах?

4) Якую агародніну вырошчваюць на калгасных палях?

**68.** Выправіце памылкі. Пастаўце знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа.

У грыбы

Алесь і пятрусь надумаліся пайсці у грыбы. Яшчэ звечара яны падрыхтавалі кошыкі нажы і адзене.

Было яшчэ цямнавата. Хлопцы увайшлі у лес. Птушкі шчабеталі заліваліся на ўсе лады.

Прыйшлі яны у сасновы бор. Першы падасінавік знайшоу алесь. Потым знаходіліся нават цэлыя семейкі баравікоу падасінавікау сыраежак.

Яшчэ сонцэ не паспела падняцца над лесам а у хлопцаў былі ўжо поуныя кошкі грыбоў. *(Паводле Я. Коласа)*

**69.** Са слоў складзіце прыказкі.

1) каб, пад, прыглядацца, ногі, не, трэба, спатыкацца.

2) у, заўсёды, сяброў, добрага, добрых, чалавека, многа.

3) калі, усюды, паспееш, рана, устанеш, дык.

4) на, сяк-так, на, яду, а, работу, мастак.

5) хлеб, калі, то, у, возе, у, няма, дарозе, бяды.

6) людзі, добра, паважаць, будзеш, працаваць, будуць.

**70.** Здагадайцеся, якія словы замянілі ў прыказках. Запішыце правільны варыянт.

1) Птушка рада зіме, а дзіця — маці.

2) Жыццё пражыць — не вуліцу перайсці.

3) Любіш катацца — любі і веласіпед вазіць.

4) Не трэба салавейку зялёная клетка, а трэба салавейку залатая ветка.

5) Адзін раз зманіш — трэці не паверадь.

6) Да чаго не дойдзеш, тое ў краме знойдзеш.

**71.** Закончыце прыказкі.

1) Рана загоіцца, ... .

2) Чалавек без сябра, ... .

3) Не хвалі сам сябе, ... .

4) З кім павядзешся, ... .

5) Не ўсё ж на бацькавай шыі сядзець, ... .

6) Самая балючая рана ... .

7) Які майстар, ... .

8) На языку — хоць куды, ... .

**72.** Дапішыце прыказкі. Заключнае слова павінна рыфмавацца з адным са слоў у першай частцы прыказкі.

1) Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе ... .

2) Садок пасадзіў — добрую справу ... .

3) Родная зямелька як зморанаму ... .

4) Няма лепшай хаткі, як у роднай ... .

5) Не зведаўшы броду, не сунься ў ... .

6) Гусі ляцяць высока — зіма яшчэ ... .

**73.** Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з'яўляюцца назвамі жывёл.

1) ... ногі кормяць.

2) ... маленькая, ды горы варочае.

3) Адна ... мёду не наносіць.

4) ... байкамі не кормяць.

5) І ... б запела, калі б голас мела.

6) І ... на сваім сметніку гаспадар.

7) Увосень і ... багаты.

8) Як ... накорміш, так і малака надоіш.

9) Слова не ...: выпусціш — не зловіш.

10) Без роднай мамачкі заклююць і ... .

**74.** Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з'яўляюцца назвамі беларускіх народных свят.

1) Прыйшоў ... , нарабіў гнілля.
2) Прыйшоў ... — лета шасць.
3) Прыйшлі ... — бліны ды аладкі.
4) ... пакрыў зямлю лістком, ваду лядком.

Словы для даведак: Калядкі, Ілля, Пакроў, Спас.

## *Адказы*

**51.** 1) Бар'ер, пад'езд, пад'ём. 2) Калье, вальер, мальберт. 3) Карэнне, світанне, жыццё. 4) Сад, град, казка. 5) Наталля, Прыпяць, Мазыр. 6) Сняжок, дзянёк, звяры. 7) Медаль, легенда, балерына. 8) Лаўка, здароўе, барадаўка. 9) У хаце, на страсе, у лесе.

**52.** Палатно — палатняны, фарфор — фарфоравы, гліна — гліняны, шоўк — шаўковы, цэгла — цагляны, дрэва — драўляны, салома — саламяны.

**53.** Пясочны гадзіннік. Тэлевізарны завод. Чытальная зала. Лясны край. Зямельны ўчастак. Звераваты позірк. Серабрысты снег.

**54.** Выць — воўк, чырыкаць — верабей, гагатаць — гусь, каркаць — варона, стракатаць — сарока, квахтаць — курыца, мяўкаць — кот, кукарэкаць — певень.

**55.** 1) Назоўнік, дзеяслоў. 2) Назоўнік, дзеяслоў. 3) Назоўнік, дзеяслоў, назоўнік, дзеяслоў. 4) Дзеяслоў, назоўнік. 5) Прыметнік, назоўнік.

**56.** Падарыў табе, сустракалі нас, гуляў з ёю, запрасіў вас, расказаў пра мяне, зайшоў да яго, сябруе са мною, паказаў на іх, адпачывалі з намі, пачаставаў яе, спыніўся каля яго.

**57.** 1) Заварка. 2) Падрэзка. 3) Насмешка.

**58.**

| | |
|---|---|
| Корань, канчатак | Дарога, дрэва, каласы, лебедзь |
| Прыстаўка, корань, канчатак | Прадзед, паднос, адвар, узгор'е |
| Корань, суфікс, канчатак | Бабраня, насавы, ліпка, журналіст |
| Корань, корань, канчатак | Пешаход, самавар, пыласос, насарог |
| Прыстаўка, корань, суфікс, канчатак | Peралесак, заморскі, узгорак, насмешка |

**59.** 5.

**60.** 1) Расцвітае луг. 3) Буран наляцеў. 6) Надыходзіў вечар.

**61.** Мураш. Пчала. Уюн. Воўк. Муха. Вуж. Вавёрка. Сарока. Заяц. Рыба. Індык.

**62.** Сенакос, лесаруб, ледакол, сокавыціскалка, землякоп, снегапад, рукамыйнік.

**63.** 1) 3. 2) 3. 3) 3. 4) 3. 5) 4.

**64.** 1) 8. 2) 6. 3) 8. 4) 7.

**65.** 1) 6. 2) 4. 3) 5. 4) 4. 5) 3.

**66.** А — 1, Б — 3, В — 5, Г — 4, Д — 2.

**67.** 1) Абласнымі цэнтрамі Беларусі з'яўляюцца Гомель, Віцебск, Мінск, Гродна, Магілёў, Брэст. 2) З выраю да нас прылятаюць буслы, ластаўкі, шпакі. 3) На клумбах можна вырошчваць астры, півоні, ружы. 4) На калгасных палях вырошчваюць моркву, бульбу, капусту.

**68.** У грыбы

Алесь і Пятрусь надумаліся пайсці ў грыбы. Яшчэ звечара яны падрыхтавалі кошыкі, нажы і адзенне.

Было яшчэ цемнавата. Хлопцы ўвайшлі ў лес. Птушкі шчабяталі, заліваліся на ўсе лады.

Прыйшлі яны ў сасновы бор. Першы падасінавік знайшоў Алесь. Потым знаходзіліся нават цэлыя сямейкі баравікоў, падасінавікаў, сыраежак.

Яшчэ сонца не паспела падняцца над лесам, а ў хлопцаў былі ўжо поўныя кошыкі грыбоў. *(Паводле Я. Коласа)*

**69.** 1) Каб не спатыкацца, трэба пад ногі прыглядацца.
2) У добрага чалавека заўсёды многа добрых сяброў.
3) Калі рана ўстанеш, дык усюды паспееш.
4) На яду мастак, а на работу сяк-так.
5) Калі хлеб у возе, то няма бяды ў дарозе.
6) Будзеш добра працаваць, будуць людзі паважаць.

**70.** 1) Птушка рада вясне, а дзіця — маці.
2) Жыццё пражыць — не поле перайсці.
3) Любіш катацца — любі і саначкі вазіць.
4) Не трэба салавейку залатая клетка, а трэба салавейку зялёная ветка.
5) Адзін раз зманіш — другі не павераць.
6) Да чаго не дойдзеш, тое ў кніжцы знойдзеш.

**71.** 1) Рана загоіцца, а злое слова ніколі.
2) Чалавек без сябра, што птушка без крылаў.
3) Не хвалі сам сябе, хай другія пахваляць.
4) З кім павядзешся, ад таго набярэшся.
5) Не ўсё ж на бацькавай шыі сядзець, пара і свой розум мець.
6) Самая балючая рана ад свайго дзіцяці.
7) Які майстар, такая і работа.
8) На языку — хоць куды, а на справе — нікуды.

**72.** 1) Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам.
2) Садок пасадзіў — добрую справу зрабіў.
3) Родная зямелька як зморанаму пасцелька.
4) Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі.
5) Не зведаўшы броду, не сунься ў воду.
6) Гусі ляцяць высока — зіма яшчэ далёка.

**73.** 1) Ваўка ногі кормяць.
2) Мурашка маленькая, ды горы варочае.
3) Адна пчала мёду не наносіць.
4) Салаўя байкамі не кормяць.
5) І варона б запела, калі б голас мела.
6) І певень на сваім сметніку гаспадар.
7) Увосень і верабей багаты.
8) Як карову накорміш, так і малака надоіш.
9) Слова не верабей: выпусціш — не зловіш.
10) Без роднай мамачкі заклююць і галачкі.

**74.** 1) Прыйшоў Ілля, нарабіў гнілля.
2) Прыйшоў Спас — лета шасць.
3) Прыйшлі Калядкі — бліны ды аладкі .
4) Пакроў пакрыў зямлю лістком, ваду лядком.

*Працяг будзе.*